УДК 930

***А.М. Сувалаў****, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь*
*(e-mail: suvalau@tut.by)*

# МЕСЦА ТЭОРЫІ «БАЛЦКАГА СУБСТРАТУ» В.В. СЯДОВА Ў ГІСТАРЫЯГРАФІІ ПРАБЛЕМЫ ЭТНАГЕНЕЗУ БЕЛАРУСАЎ 60-х – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ 80-х гг. ХХ ст.

*Разглядаецца сутнасць тэорыі «балцкага субстрату» савецкага, а затым расійскага археолага В.В. Сядова і ўплыву яго даследаванняў на погляды вучоных на этнагенез беларусаў у гістарыяграфіі 60-х – першай паловы 80-х гг. ХХ ст. Вызначаюцца ўзаемадачыненні канцэпцыі аб «старажытнарускай народнасці» і тэорыі «балцкага субстрату» В.В. Сядова. Вызначаецца месца даследаванняў В.В. Сядова ў фарміравнні тагачасных поглядаў і падыходаў да праблемы этнагенезу беларусаў.*

*Ключавыя словы: беларусы, этнас, гістарыяграфія, тэорыя «балцкага субстрату», канцэпцыя «старажытнарускай народнасці», этнагенез, этнічная гісторыя.*

Для разумення агульных тэндэнцый развіцця сучаснай айчыннай гістарыяграфіі праблемы этнагенэзу беларусаў неабходна асаблівую ўвагу надаць перыяду 60-х – першай паловы 80-х гг. ХХ ст. У вызначаны час з'явілася і бурна абмяркоўвалася ў навуковым асяроддзі тэорыя «балцкага субстрату» савецкага, а пазней расійскага археолага В.В. Сядова. Для даволі павольнага развіцця навуковых даследаванняў абазначанай праблемы этнічнага мінулага беларусаў пасляваеннага часу выступленне В.В. Сядова стала нечаканасцю і свайго роду навуковай сенсацыяй.

Сітуацыя з тэорыяй В.В. Сядова будзе больш зразумелай, калі нагадаць наступнае. Першае дзесяцігоддзе пасля падзей Кастрычніка 1917 г. характарызавалася даволі бурным развіццём разнастайных поглядаў і тэорый на паходжанне і этнічнае мінулае беларусаў, цэнтральнае месца сярод якіх займала першая навуковая канцэпцыя этнагенезу беларусаў Я.Ф. Карскага. Гэта было абумоўлена тым, што старая ідэалагічная сістэма былой Расійскай імперыі была ліквідавана, а новая савецкая марксісцка-бальшавіцкая ідэалогія яшчэ не выпрацавала свае эталонныя палажэнні. Указаны перыяд бурнага развіцця ў вывучэнні беларускага мінулага змяняецца агульным застоем у галіне даследаванняў па гісторыі Беларусі, які прыпадае на перыяд другой паловы 20-х – пачатку 50-х гг. ХХ ст. Аб'ектыўныя прычыны застою і заняпаду крыліся перш за ўсе у той палітыцы, што праводзілася ў СССР у цэлым і ў БССР у прыватнасці. Гаворка ідзе пра перыяд, які пачаўся з барацьбы з гэтак званымі «нацыянальнымі дэмакратамі» («нацдэмамі») і рознага роду «ўхіламі» як унутры партыі бальшавікоў, так і ў грамадстве ў цэлым. З канца 20-х і на працягу 30-х гг. ХХ ст. значная частка навуковых кадраў тагачаснай Беларусі (у тым ліку і тых, хто займаўся праблемай паходжання беларусаў) у той ці іншай форме была падвергнута рэпрэсіям за свае рэальныя ці фіктыўныя злачынствы супраць савецкай сістэмы, за свае палітычныя ці нацыянальныя перакананні. Такім чынам, праблема этнагенезу беларусаў адчула ў гэты час моцны ўплыў ідэалагічнага фактару і пераўтварылася з навуковай у праблему, якая мае палітычную і ідэалагічную актуальнасць. Нежаданне і апасенні вучоных атрымаць ярлык «нацдэма» і нацыяналіста з усімі вынікаючымі наступствамі замаруджвалі свабоду пошуку вучоных у гэтым накірунку. Аб'ектыўна рэпрэсіі супраць даследчыкаў праблемы этнагенезу беларусаў далека не заўседы былі звязаны з іх навуковымі пазіцыямі. Аднак самі рэпрэсіі рэзка звузілі асяроддзе навукоўцаў, якія займаліся разглядаемай праблемай. Былі фактычна ліквідаваны навуковыя школы, а навуковая дыскусія набыла ідэалагічны падтэкст. Гэта практычна блакіравала свабоду даследчыцкага пошуку, значна скараціла поле навуковай дыскусіі. Сітуацыя ўскладняецца ў перыяд Другой Сусветнай вайны, калі тэма этнічнага мінулага беларусаў стала складаючай часткай у ідэалагічных пабудовах беларускіх калабарацыяністаў. Імкненне абвергнуць падобныя пазіцыі выклікала публікацыю шэрагу матэрыялаў навукова-прапагандысцкага характару па этнагенезу беларусаў і ў савецкай навуцы. Як вынік такога развіцця сітуацыі практычна спыняюцца даследаванні па праблеме этнагенезу беларусаў, а тыя, якія публікуюцца ў БССР і СССР, становяцца

аднатыпнымі і схематычнымі. Схематычнасць выражаецца не толькі ў тым, што выпрацоўваюцца нейкія агульна прынятыя палажэнні і канцэпцыі працэсу этнічнага развіцця беларускага народа, або ў цэлым усходніх славян. Схематычнасць праяўляецца і ў тлумачэнні працэсаў этнічнага паходжання беларусаў і народаў Усходняй Еўропы ў цэлым. Іншымі словамі, навука ў пасляваенны перыяд мела сваё развіццё праз павялічэнне колькасці вучоных, якія займаліся рознымі праблемамі, звязанымі з этнагенезам беларусаў, праз рост колькасці навуковых публікацый, але ўсё больш праяўлялася тэндэнцыя на паўтарэнне і перапісванне ўстаяўшыхся схем працэсаў этнічнага развіцця беларусаў. Новыя падыходы і канцэпцыі не з’яўляліся. Ідэалагічны кантэкст праблемы, а таксама нежаданне айчынных вучоных (перш за ўсё вучоных БССР) закранаць праблему паходжання беларусаў, каб пазбегнуць магчымых паралеляў з поглядамі, якія належылі праціўнікам савецкай улады, сталі прычынай сапраўднага застою ў вывучэнні праблемы этнічнага мінулага беларусаў. На такім фоне тэорыя «балцкага субстрата» В.В. Сядова [1, 2] стала практычна навуковай сенсацыяй з улікам вельмі асцярожных і мала выразных публікацый айчынных вучоных пасляваенага перыяду, нават такіх значных па сваім аб’еме як манаграфіі М.Я. Грынблата [3] і Я.І. Карнейчыка [4].

У аснове поглядаў В.В. Сядова – ідэя, якую развівалі і даказвалі расійскія вучоныя яшчэ дакастрычніцкага часу. Сутнасць яе састаяла ў тым, што да прыходу ва Ўсходнюю Еўропу славян гэтыя тэрыторыі былі заселены рознымі этнасамі: землі будучай Расіі – фіна-уграмі, землі будучай Украіны – цюркамі, а землі будучай Беларусі – балтамі. Так, В.В. Сядоў падкрэсліваў наяўнасць безумоўнага ўплыву ўказаных субстратаў на этнічнае развіццё славян Усходняй Еўропы. Неабходна нагадаць, што археалагічныя даследаванні маюць справу з матэрыяльнымі рэшткамі культуры насельніцтва ранейшага часу. Таму нельга чакаць ад археалагічных даследаванняў таго, што яны дадуць дакладныя і адназначныя тлумачэнні ў адказ на пытанне пра этнічную прыналежнасць таго насельніцтва, якое пакінула тыя ці іншыя рэшткі даследуемай археалагічнай культуры. Яны могуць зафіксаваць пэўную блізкасць, ці, магчыма, тоеснасць матэрыяльнай культуры пэўных рэгіенаў. Аднак гэта не з’яўляецца аб’ектыўным доказам таго, што насельніцтва з блізкімі, ці нават тоеснымі археалагічнымі культурамі мела аднолькавае ўяленне пра сваю этнічную прыналежнасць і паходжанне. Менавіта гэты аспект трэба мець на ўвазе пры ацэнцы тэорыі «балцкага субстрата» В.В. Сядова. Ен як археолаг цалкам параканаўча даказаў, што той регіен, які пазней амаль цалкам супаў з тэрыторяй распаўсюджання беларускага этнаса, да прыходу сюды славян прыкладна тысячу год быў заселены насельніцтвам балцкай групы. Таксама важны аспект даследаваннаў В.В. Сядова састаяў у тым, што вучоны даказаў тэзіс: раней пражываючыя на тэрыторыях будучых беларусаў балты нікуды не сыходзілі, і, такім чынам, увайшлі ў склад беларускага этнасу [2, с. 115–116].

Указаныя навуковыя даследаванні па ацэнках значнай часткі савецкіх вучоных парушалі стройнасць і цэласнасць пасляваеннай ідэалагічна вытрыманай канцэпцыі пра «старажытнарускую народнасць» як агульную «калыску» трох усходнеславянскіх народаў – велікарусаў, украінцаў і беларусаў. На перыяд апублікавання палажэнняў тэорыі «балцкага субстрата» В.В. Сядова айчынная гістарыяграфія прыняла ідэі, паслядоўнымі прыхільнікамі якіх выступалі У.В. Маўродзін, С.А. Токараў, Б.А. Рыбакоў, П.М. Трэцякоў і інш. Сутнасць пазіцый гэтых вучоных састаяла ў тым, што ўсходнія славяне ў адрозненні ад іншых славянскіх аб’яднанняў (такіх як заходнія і паўднёвыя славяне) мелі агульны этап этнічнага развіцця – этап «старажытнарускай народнасці». Тэрмін «старажытнаруская народнасць» быў прапанаваны У.В. Маўродзіным, і тагачасная гістарычная навука прыняла яго як найбольш удалы. Ва ўмовах часу, калі канчаткова была сфармулявана ідэя пра «старажытнарускую народнасць» як агульную «калыску» рускіх (велікарусаў), украінцаў і беларусаў, падобная ідэя была вельмі патрэбнай з пазіцый тагачаснай савецкай ідэалогіі. У гэтай сувязі даволі цяжка правесці дакладную мяжу паміж навуковымі поглядамі вучоных і іх уласна ідэалагічнымі перакананнямі. З пазіцый тагачаснай савецкай ідэалогіі канцэпцыя аб «старажытнарускай народнасці» менавіта ў часцы доказу былой еднасці трох асноўных народаў Савецкага Саюза адыгрывала ролю гістарычнага абгрунтавання дэкларацыі пра стварэнне новой гістарычнай супольнасці – «савецкага народа». Спрошчана схема прадстаўлялася наступным чынам. Усходнія славяне, засяліўшыя Ўсходнюю Еўропу, з IX ст. утвараюць этнічную еднасць («старажытнарускую народнасць»), якая праіснавала да XIII ст. Па-

рушэнне ўказанай еднасці звязвалася з палітычным адасабленнем частак былой Кіеўскай Русі ў сувязі з наступленнем перыяду феадальнай адасобленасці і такім знешнепалітычным фактарам, як татара-мангольская агрэсія з усходу і агрэсія крыжакоў з захаду. Усталяванне татара-мангольскага іга на тэрыторыях будучых Расіі і Ўкраіны, з аднаго боку, і літоўскага, а затым лацінска-польскага ярма на тэрыторыі будучай Беларусі ў выглядзе Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) і Рэчы Паспалітай абодвух народаў Кароны Польскай і Вялікага княства Літоўскага (стварэнне ВКЛ разглядалася ў савецкай гістарыяграфіі як вынік барацьбы балтаў супраць крыжацкай агрэсіі, у сувязі з чым балты захапілі і частку ўсходнеславянскіх зямель – тэрыторыю будучай Беларусі), з другога боку, парушыла працэс развіцця «старажытнарускай народнасці» як адзінай этнічнай супольнасці. Часткі «старажытнарускай народнасці», раз’яднаныя ў розныя дзяржаўныя ўтварэнні, пачынаюць адчуваць ціск рознанацыянальнага (татара-мангольскага ў будучай Расіі і балцкага, а затым і польскага ў ВКЛ) і іншарэлігійнага (тут гаворка ідзе толькі пра каталіцкі ўплыў на славянскае насельніцтва ВКЛ) элементаў. Вынікам гэтага згодна з пануючымі на той час у савецкай навуцы поглядамі сталі працэсы ўзмацнення старых мясцовых асаблівасцей, якія меліся яшчэ ў эпоху саюзаў плямён (перыяд да IX ст.) і не былі канчаткова нівеліраваны ў час «старажытнарускай народнасці». Таксама адбываецца набыццё паасобнымі часткамі ўсходніх славян новых рыс пад уплывам «польска-каталіцкага ярма». Вынікам абазначаных тэндэнцый стала парушэнне еднасці «старажытнарускай народнасці» і фарміраванне трох брацкіх народаў: рускіх (велікарусаў), украінцаў і беларусаў.

Імпліцыдна акрэсленая схема этнічнага развіцця Ўсходняй Еўропы з пазіцый савецкай ідэалогі даводзіла, што сучасная (для таго часу) сітуацыя, пры якой рускія (велікарусы), украінцы і беларусы зліваюцца разам з іншымі народамі Савецкага Саюза ў агульную еднасць – савецкі народ, – з’ява цалкам натуральная, якая мае сваю гісторыю і свой пачатак у старажытнасці. Адсюль лагічным, аднаўляючым гістарычную справядлівасць выступаў працэс фарміравання новай гістарычнай супольнасці – «савецкага народа».

В.В. Сядоў, калі судзіць па пазнейшым падзеям, не чакаў настолькі бурнай рэакцыі на свае даследаванні ў галіне субстратнага ўздзеяння балцкага насельніцтва на беларусаў. Адразу некалькі крытычных публікацый П.М. Трэцякова [6, с. 108–118], В.А. Жучкевіча [7, с. 107–113], М.Я. Грынблата [8, с. 79–92] і Г.А. Хабургаева [9, с. 94–99] былі змешчаны ў часопісе «Савецкая этнаграфія» ў 1967 і 1968 гг., а артыкул Г.А. Хабургаева ў 1971 г. Галоўны тэзіс, вакол якога працякала дыскусія, – ці пярэчыць прызнанне факта ўдзелу балцкага субстрату ў этнагенезе беларусаў існаванню «старажытнарускай народнасці». В.В. Сядоў даводзіў, што ацэнка рэштак матэрыяльнай культуры насельніцтва Беларусі перыяду славянскага засялення яскрава даказвае ўдзел балтаў у этнагенезе беларусаў [10, с. 118]. Свае аргументы аб субстратным удзеле балтаў на славян Беларусі ён падмацоўваў і данымі з этнаграфіі і фальклору беларусаў (культ вужа, які бытаваў як у балтаў, так і ў беларусаў і г. д.). Па меркаванню В.В. Сядова, удзел балтаў у этнагенезе беларусаў працякаў у перыяд славянскага засялення тэрыторыі Беларусі. Прынята лічыць, што славянскае засяленне Беларусі пачынаецца з VI ст. н. э. і звязана яно з апошнімі хвалямі «Вялікага перасялення народаў». Частка тэрыторыі Беларусі (паўночны захад), магчыма, з’яўляецца адной з частак тэрыторыі першасных славян (тэрыторыі, дзе славяне сфарміраваліся менавіта як славяне). Крытыкі тэорыі В.В. Сядова ўказвалі, што ўздзеянне «балцкага субстрата» на этнагенез беларусаў храналагічна супадае з перыядам існавання «старажытнарускай народнасці» (перыяд IX–XIII стст.). Логіка апанентаў В.В. Сядова састаяла ў тым, што калі «балцкі субстрат» прывеў да фарміравання тых асаблівасцей, якія прызнаюцца беларускімі, то, адпаведна, беларускі этнас сфарміраваўся непасрэдна на аснове славянскіх саюзаў плямен (крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў) і мясцовых балтаў. Адпаведна такі этап, як «старажытнаруская народнасць», станавіўся лішнім у схеме этнічнага развіцця Ўсходняй Еўропы. Амаль поўнае супадзенне этнічнай тэрыторыі беларусаў сапраўды ўказвала на наяўнасць несумненнай сувязі паміж гэтымі момантамі. Але трактоўкі ўказанай залежнасці этнічнай тэрыторыі беларусаў і распаўсюджвання балцкага насельніцтва В.В. Сядовым і яго апанентамі былі рознымі. Сам В.В. Сядоў не бачыў супярэчнасцяў ва ўказаных момантах. У далейшым ён выступаў з грунтоўнымі манаграфічнымі публікацыямі, дзе імкнуўся давесці тэзіс пра тое, што наяўнасць балцкага субстрата ў этнагенезе беларусаў (аналагічна, дарэчы, як і наяўнасці фіна-угорскага субстрата ў этнагенезу велікарусаў,

ці наяўнасць цюркскага субстрата ў этнагенезе ўкраінцаў) не супярэчыць канцэпцыі пра «старажытнарускую народнасць» [11, с. 269–291; 12, с. 180–219; 13, с. 525–531, 570–574]. Апошнія публікацыі В.В. Сядова ўказваюць на яго як на прыхільніка канцэпцыі пра этнічную і моўную еднасць славян. Указаная еднасць згодна з яго пазіцыямі была парушана ў пазнейшыя перыяды як следства перасяленняў і тэрытарыяльнага пашырэння межаў распаўсюджання славян. Славяне, сустрэўшы на новых землях неславянскія этнічныя аб'яднанні, уступаюць з імі ва ўзаемадзеянне, губляюць былую этнічную і моўную еднасць, фарміруюць новыя этнічныя еднасці: велікарусаў, украінцаў і беларусаў.

Тыкім чынам, значэнне тэорыі «балцкага субстрату» В.В. Сядова ў вывучэнні праблемы этнагенезу беларусаў састаіць не толькі ў тым, што была прапанавала новая тэорыя (асабліва ўлічваючы, што яна мела сваіх папярэднікаў у дакастрычніцкі перыяд), але і ў тым, што яна з'явілася ў час, калі спроба самастойнага разгляду праблемы этнагенезу ёсць ужо сама па сабе рэвалюцыйная падзея.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Седов, В.В. О происхождении белорусов / В.В. Седов // Древности Белоруссии : материалы конф. по археологии Белоруссии и смежных территорий / Акад. наук БССР, Отд-ние обществ. наук, Ин-т истории; под ред. В.Ф. Исаенко [и др.]. – Минск, 1966. – С. 301–309.

2. Седов, В.В. К происхождению белорусов (проблема балтского субстрата в этногенезе белорусов) / В.В. Седов // Совет. этнография. – 1967. – № 2. – С. 112–129.

3. Гринблат, М.Я. Белорусы: очерки происхождения и этнической истории / М.Я. Гринблат. – Минск : Наука и техника, 1968. – 288 с.

4. Карнейчык, Я.І. Беларуская нацыя : гіст. нарыс / Я.І. Карнейчык. – Мінск : Навука і тэхніка, 1969. – 309 с.

5. Седов, В.В. К происхождению белорусов (проблема балтского субстрата в этногенезе белорусов) / В.В. Седов // Совет. этнография. – 1967. – № 2. – С. 112–129.

6. Третьяков, П.Н. Восточные славяне и балтский субстрат / П.Н. Третьяков // Совет. этнография. – 1967. – № 4. – С. 110–118.

7. Жучкевич, В.А. К вопросу о балтийском субстрате в этногенезе белорусов / В.А. Жучкевич // Совет. этнография. – 1968. – № 1. – С. 107–113.

8. Гринблат, М.Я. К происхождению белорусской народности (по поводу теории субстрата) / М.Я. Гринблат // Совет. этнография. – 1968. – № 5. – С. 79–92.

9. Хабургаев, Г.А. Этнический состав Древнерусского государства и образование трех восточнославянских народностей (логические и линвистические замечания к обсуждению «первопричины» образования белорусской народности) / Г.А. Хабургаев // Совет. этнография. – 1972. – № 1. – С. 85–99.

10. Седов, В.В. Еще раз о происхождении белорусов / В.В. Седов // Совет. этнография. – 1969. – № 1. – С. 105–121.

11. Седов, В.В. Восточные славяне в VI–XIII вв. / В.В. Седов. – М. : Наука, 1982. – 326 с.

12. Седов, В.В. Древнерусская народность: историко-археологическое исследование / В.В. Седов. – М. : Языки слав. культуры, 1999. – 318 с.

13. Седов, В.В. Славяне: историко-археологическое исследование / В.В. Седов. – М. : Яз. слав. культуры, 2002. – 624 с.

Дата поступления в редакцию: 12.07.17

***A.K. Suvalau****, Candidate of Historical Sciences, Associate Professor, Lecturer at the Department of Theory and the History of State and Law of the Academy of the MIA of the Republic of Belarus*

THE PLACE OF THE «BALTIC SUBSTRATUM» THEORY OF V. SEDOV IN THE HISTORIOGRAPHY OF THE PROBLEM OF THE ETHNOGENESIS OF BELARUSIANS IN THE 60'S – THE FIRST HALF OF 80-IES XX CENTURY

*In the article the essence of the theory of the «Baltic substratum» of the Soviet and then Russian archaeologist V. Sedov and the influence of his research on the views of scientists on the ethnogenesis of the Belarusians in the historiography of the 60s – the first half of the 80s of the XX century are examined. The relationship between the concept of the «Old Russian nationality» and the theory of the «Baltic substratum» of V.V. Sedov is defined. The place of V. Sedov's research in the formation of the then views and approaches to the problem of the ethnogenesis of the Belarusians is indicated.*

*Keywords: Belarusians, ethnos, historiography, the theory of «Baltic substratum», the concept of «Old Russian nationality», ethnogenesis, ethnic history.*